# ГІСТОРЫЯ. ПАЛІТЫКА




**1. КАМУНІЗМ ЯК ФОРМА РУСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ –** Нью-Ёрк, Беларускае Выдавецкае таварыства ў Амэрыцы (БВТА), 2000 г., 10 стар.

У артыкуле, які атрымаў вялікі розгалас, камунізм разглядаецца як таталітарная форма імпэрскай улады, аналізуецца сістэма ўлады, палітыкі і ідэалёгіі, якая існавала ў былой расейскай імпэрыі (Савецкі Саюз) з 1917 па 1991 гг.: як і калі была заснаваная, што вызначала яе сутнасьць і стыль, чаму былі непазьбежныя масавыя рэпрэсіі, расстрэлы і лягерная сістэма ГУЛАГ, чаму Беларусь была асаблівым аб’ектам рускай палітыкі і зонай русіфікатарскіх экспэрыментаў.

Надрукаваны таксама ў кн. “Цяжкі час”, кніга 2. (Стар.264-268)




**2. НОВАЕ СТАГОДДЗЕ.** -- Варшава, “Беларускія Ведамасьці”, 2002 г., 108 стар.: іл.

Спэцыяльная сэрыя артыкулаў, напісаная (у асноўным) у першым годзе навага XXI-га стагоддзя – у 2001-м. Кніга аб гісторы і культуры Беларусі ў XX стагоддзі. Артыкулы разьлічаныя на шырокага чытача, на людзей, якія любяць Бацькаўшчыну. Пісалася, галоўным чынам, для тых беларусаў, якія (у выніку агульных абставінаў) ня мелі магчымасьці атрымаць беларускую адукацыю і карысаліся чужой сістэмай ведаў.

Вось некаторыя назвы артыкулаў: Беларускі сьцяг, Эліта, Свабода, Урбанізацыя, Тэлевізар, Эгалітарызм, Вялікія людзі, Вера і палітыка, Традыцыя, Унутраная акупацыя, Антыбеларуская прапаганда, Фізічнае зьнішчэньне беларускай нацыі, Вялікі Купала, Амэрыка – для амэрыканцаў -- і шмат іншых.




**3. БЕЛАРУСКА-РАСЕЙСКАЯ ВАЙНА. BELARUS IS AN EASTERN OUTPOST.** -- 2-е выданьне. (На беларускай і ангельскай мовах.) **–** Варшава,”Беларускія Ведамасьці”, Нью-Ёрк, Вільня, Таварыства Беларускай культуры ў Летуве. -- 2005 г., 34 стар.

Аналітычны артыкул (выдадзены асобнай брашурай), дзе даецца аналіз беларуска-расейскаму канфлікту, які цягнецца стагоддзямі і прывёў да катастрафічных вынішчэньняў на Беларусі, раскрываецца мэтанакіраваная палітыка Расеі на зьнішчэньне беларускага народу на культурна-гістарычным і этнічным узроўні, пабудаваная на распрацаванай мэтадалогіі русіфікацыі і вынішчэньні. (Гл. разьдзелы артыкула: мэтадалёгія, бальшавізм, новыя тэхналёгіі, гэбізм, трэці патоп). Гэтак сама разглядаюцца шляхі пераадоленьня цяжкога становішча Айчыны.
**3-А.** Артыкул зьмешчаны і ў кн. 3: “Цяжкі час – працяг”. Стар. 554-567)




**4. ГУТАРКІ З АНТОНАМ ШУКЕЛОЙЦЕМ.** -- Варшава, “Беларускія Ведамасьці”, Вільня. Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, -- 2003 г., -- 144 стар.: іл.

Кніга пра кіраўніка Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня на эміграцыі Антона Шукелойця, (1915 – 2017 гг.) пра ўжо далёкую пару 1930-1940-з гадоў, якія гэтак перакручаныя, сфальшаваныя і замоўчаныя вечнымі ворагамі Беларусі. А. Шукелойць, пражыўшы 101 год, стаўся назіральнікам і удзельнікам палітычных плыняў і падзеяў беларускай гісторыі. Мы даведаемся, як адбівалася палітычнае жыцьцё Вільні на студэнцкім жыцьці ў 1935-39 гадах, пра першыя саветы на Віленшчыне (1939-1941 гг.), нямецкую акупацыю ў Менску, пра стварэньне і дзейнасьць патрыятычнай падпольнай **Беларускай Незалежніцкай Партыі** і яе задачах пад час акупацыі, аб выхаваньні сотняў маладых беларускіх афіцэраў, аб ратаваньні ад зьнішчэньня габрэяў, пра знаёмства зь Вільгельмам Кубэ (кіраўніком нямецкай цывільнай адміністрацыі ў акупаванай Беларусі), пра Кангрэс Беларускай Цэнтральнай Рады, пра аднаўленьне дзейнасьці Рады БНР, аб утварэньні Беларускай Аўтакефаліі праваслаўнай царквы ў 1942 г. і шмат іншых цікавых малавядомых фактаў.

**5. ПРАМАСКОЎСКІ РЭЖЫМ АЛЬБО ЯК АДБЫВАЕЦЦА РАЗБУРЭНЬНЕ БЕЛАРУСІ.**
-- Нью-Ёрк, Беларускае Выдавецкае таварыства ў Амэрыцы (БВТА), -- 2005 г., 20 стар.




Тут разглядаюцца пытаньні акупацыйнай палітыкі: абніжэньне адукацыйнага ўзроўню грамадзтва, разбурэньне фундамэнтальнай навукі, паступовае разбурэньне нацыянальнай бібліятэкі, стварэньне падстаўной апазыцыі, паступовая ізаляцыя Беларусі ад усяго сьвету, прычыны замены насельніцтва ў краіне, адмоўнае значэньне палітыкі “непрадрашэнства” ў змаганьні за Беларусь і інш.

У зьвязку з выказанымі поглядамі аўтар робіць акцэнт на пытаньні, што ёсьць грунтам канцэпцыі Беларускага Нацыянальнага Адраджэньня.

**6. ПРАМАСКОЎСКІ РЭЖЫМ АЛЬБО ЯК АДБЫВАЕЦЦА РАЗБУРЭНЬНЕ БЕЛАРУСІ.**
-- 2-е выданьне. **–** Нью-Ёрк, Беларускае Выдавецкае таварыства ў Амэрыцы (БВТА), -- 2005 г., 20 стар.




**7. НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЬЦІ.** Культурна-асьветніцке выданьне. -- “Беларускія Ведамасьці”, Варшава, 2007 г., 56 стар. (Містыфікацыя: кн. выдаденая ў Беларусі)




**8. НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЬЦІ.** Грамадзка-асьветніцкае выданьне. (Выбраныя артыкулы.) -- “Беларускія Ведамасьці”, Варшава-Нью-Ёрк; Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, -- Вільня, 2009 г. – 192 стар.

Зборнік артыкулаў на тэму беларускай гісторыі, культуры і дэмакратыі. Дасьледуюцца пытаньні станаўленьня нацыянальнай сьведамасьці і ідэалёгія нацыянальна-культурнай супольнасьці, праблемы выжываньня і разьвіцьця культуры ў неспрыяльных абставінах. Пытаньні беларускай культуры разглядаюцца на фоне глабальных працэсаў культуралёгіі і разьвіцьця.




**9. Кніга 1 -- “РАЗВАГІ”, артыкулы і матэрыялы (1990 – III. 1996).** Варшава-Нью-Ёрк-Вільня, “Беларускія Ведамасьці”, Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, -- Вільня, 2007 г., -- 312 стар.: іл.

Зьмест кнігі – гэта збор выбраных артыкулаў, выступаў, аналітычных матэрыялаў аўтара, надрукаваных у пэрыядычным беларускім друку на працягу першай паловы 90-х гг. па сакавік 1996 г. (пачатку эміграцыі аўтара). Яна складаецца з дзьвюх частак:
1-я – выбраныя артыкулы, у якіх акрэсьленыя праграма і задачы палітычнай дзейнасьці Беларускага Народнага Фронту ў змаганьні з савецкай акупацыяй і камунізмам за дэмакратыю і незалежнасьць і далей – у пэрыяд будаўніцтва незалежнай Беларускай дзяржавы. Разглядаюцца таксама пытаньні паліталёгіі, этыкі, гісторыі мастацтва, стратэгіі і тактыкі Адраджэньня;
2-я частка акрэслена як “Дадатак”, падаюцца копіі дакумантаў, артыкулаў, палітычных заяваў, зваротаў і мэмарандумаў па беларускай палітыцы і культуры.

**<u>КАНЦЭПЦЫЯ НОВАГА БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭНЬНЯ – 4 кнігі (працяг будзе)</u>**




**10. Кніга 2 -- "ЦЯЖКІ ЧАС", артыкулы і матэрыялы (1996 – 2002).** -- Варшава-Нью-Ёрк-Вільня, "Беларускія Ведамасьці", Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, -- 2010 г., -- 476 стар.: іл.

Гэта 2-гі том выданьня аб канцэпцыі беларускай незалежнасьці і нацыянальнага Адраджэньня пасьля расколу Беларускага Народнага Фронту (1999 г.) і стварэньня неадраджэнцкай псэўдаапазыцыі пры дапамозе нямецкай выведкі (Ганс Вік) у супрацоўніцтве з КГБ.

Партыя КХП-БНФ правяла шэраг навукова-тэарытычных канфэрэнцыяў аб праблемах нацыянальнай барацьбы за незалежнасьць, імкнучыся сістэматызаваць барацьбу за волю і дзяржаўнае адраджэньне нацыі. За аснову быў узяты такі падыход: абагульненьне палітычнай практыкі і працэсу змаганьня, інфармацыя пра падзеі і факты -- аналіз і высновы.

Усё гэта – дарога адраджэнскага руху ў змаганьні, якая зафіксавана ў шэрагу артыкулаў, выступаў.

Кніга прысьвечана часу з красавіка **1996 г.** і па **2002 г.** (складзена па такой схеме, як 1-я кніга **"Развагі"**). Тут аўтарскія тэксты, ілюстрацыі і дадаткі (дакуманты, розныя інфармацыйныя артыкулы-матэрыялы, фатаграфіі, сканаваныя копіі газэт і часопісаў). У кнізе даецца характарыстыка ўнутранай акупацыі, расейскага гэбізму, падстаўной апазыцыі, разбуральнай дзейнасьці Віка ў Беларусі, Беларускай салідарнасьці, тлумачыцца значэньне мовы ў жыцьці нацыі. Гэтаксама разглядаюцца наступствы Чарнобыльскай катастрофы для Беларусі, значэньне Курапатаў, Слуцкі Збройны Чын, расейскія прэтэнзіі, падвойныя стандарты Эўразьвязу і г. д.

Пэрыяд, адлюстраваны ў кнізе, супадае з найцяжэйшым жыцьцёвым станам і паваротам у асабістым жыцьці аўтара – змаганьнем у эміграцыі, кіраваньнем фронтаўскай змагарнай дзейнасьцю з-за мяжы. Гэтыя часы ня былі часам грамадзкага ўздыму. Беларусь апускалася ў цемру ганьбы і вынішчэньня, перажываючы вельмі цяжкі час разбурэньня ўсяго беларускага. Таму Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя – БНФ адну з галоўных задач для сябе ставіла нацыянальнае асьветніцтва і распаўсюд ідэй Адраджэньня. Асьветніцкая ўстаноўка якраз адбілася ў гэтай кнізе.

Тут зьмешчаны выдатны артыкул Ул. Старчанкі "Вялікая Чарнобыльская вайна".

**11. Кніга 3 -- "ЦЯЖКІ ЧАС", ПРАЦЯГ. Артыкулы і матэрыялы (2003-2010).** -- Варшава – Нью-Ёрк - Вільня, "Беларускія Ведамасьці", Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, 2010 г., -- (працяг старонак 1-й кнігі: старонкі 481 – 940), -- 464 стар.: іл.

Гэта працяг кн. 2. мае агульны тытул і нумарацыю старонак. Яны зьвязаны адной тэмай – адлюстраваньнем "цёмнага часу" і змаганьня з антыбеларускай сістэмай улады.

Унутраную акупацыю мы перажываем упершыню ў гісторыі. За 16 год цёмнага часу вынішчаныя культурныя здабыткі (якія ў найцяжэйшых умовах савецкага палітычнага прыгнёту ўдалося яшчэ захаваць). Рэзка абнізіўся культурны і адукацыйны ўзровень моладзі, мізэрнымі сталі духоўныя запатрабаваньні людзей і, як вынік, -- апатыя і бязраднасьць. Улада ўплывае на грамадзтва і палітычна, і заканадаўча, і сваім маральным узроўнем, культурай, лексікай, паводзінамі. Ніколі наша нацыя не трапляла ў стан такой ганьбы ад сузіраньня хамства




рэжыму, зьдзеку над асобай, сям'ёй, выхаваньнем, культурай і мовай.

Сутнасьць гэтага разбурэньня – этнацыд, сэнс палітыкі – русіфікацыя.

Тут сабраны працы і матэр'ялы, якія адлюстроўваюць думкі і дзеяньні беларускага змаганьня за волю нашай Айчыны, за вечнасьць нашага вялікага народа.




**12. Кніга 4 -- "ЦЯЖКІ ЧАС. РАЗБУРЭНЬНЕ. Платформа беларускага змаганьня, артыкулы і матэр'ялы (2011-2015)** -- Варшава-Нью-Ёрк, "Беларускія Ведамасьці", 2018 г., -- 562 стар.

Тут сабраны артыкулы і матар'ялы падзеяў 2011-2015 гг. Гэта час актывізацыі акупацыйнай русіфікатарскай палітыкі рэжыму і разбурэньня беларускай грамадзянскай супольнасьці, час разбурэньня ялцінскага парадку сьвету ў выніку ваеннай агрэсіі Расеі супраць Украіны (2014 г.). Гэта гібрыдная вайна і расейская прапаганда, накіраваная на Беларусь праз маскоўскае тэлебачаньне, раскалола беларускае грамадзтва. Нацыянальна-Вызвольнаму сэктару грамадзтва стала відавочнай падрыхтоўка да захопу Беларусі па ўкраінскаму сцэнару. Гэта тэма стала галоўнай у гэтай кнізе, паказвае зьмест гістарычнага часу разбурэньня беларускай нацыі і выяўляе ацэнкі падзеяў з пазыцый нацыянальнага змаганьня за Беларусь.




**13. ДЭКЛЯРАЦЫЯ – ПЕРШЫ КРОК ДА НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ.** -- Варшава, "Беларускія Ведамасьці", -- 2010 г., 30 стар.

Грамадзка-палітычнае выданьне аб змаганьні дэпутатаў Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце 12-га склікаmake ньня (1990 -- 9.01.1996 гг.) за прыняцьце Дэклярацыі аб суверэнітэце Беларусі. Брашура выдадзена да 20-х угодкаў прыняцьця Дэклярацыі аб суверэнітэце Беларусі. Выданьне разьлічанае на шырокага чытача.




**14. “СЭСІЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ”.** -- Варшава, “Беларускія Ведамасьці”, -- 2011 г., 376 стар, : іл.

Тут друкуецца стэнаграма Сэсіі ВС БССР (24-25 жніўня 1991 г.), калі была прынята незалежнасьць Беларусі: зь якімі цяжкасьцямі прымалася, хто быў “за” – хто “супраць” (дарэчы, супраць быў С. Шушкевіч, і гэта задакумэнтавана, але потым у канцы, калі перамога незалежнікаў БНФ стала відавочнай, ён прагаласаваў за незалежнасьць), як цяжка ішла дыскусія і гістарычнае галасаваньне. Пра гэта напісана мала, а сама стэнаграма ў асноўным зьнішчана рэжымам Лукашэнкі. Можна сказаць, што гэта кніга рэдкая і ўнікальная, вельмі важная для тых, хто цікавіцца нашай гістарычнай падзеяй аб тым калі мы сталі Рэспублікай Беларусь. Кніга складаецца з уступнага артыкула З. Пазьняка, факсімільны друк стэнаграмы (4 сшыткі). У канцы, у дадатку, -- зьвесткі пра выступоўцаў на Сэсіі, передрукі некаторых выступаў, выявы дэпутатаў БНФ.




**15. “ДЭПУТАТЫ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ”** -- Нью-Ёрк, Вільня, Варшава, “Беларускія Ведамасьці”, Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, -- 2010 г., 304 с.,: іл.

Кніга выдадзена да ХХ-й гадавіны незалежнасьці Беларусі. Гэта зборнік артыкулаў, напісаныя двума аўтарамі -- **Зянонам Пазьняком** і **Сяргеем Навумчыкам** – аб падзеях беларускай нацыянальнай рэвалюцыі ў пачатку 90-х гг., аб здабыцьці незалежнасьці ў жніўні 1991 г., аб палітыцы і дзеяньнях дэпутатаў Апазыцыі БНФ ў Вярхоўным Савеце 12-га скліканьня (1990 – 9.01.1996).

Тут зьмешчаны таксама кароткія зьвесткі пра ўсіх дэпутатаў Незалежнасьці. У “Дадатку” – фатаграфіі з падзей 90-х гадоў, здымкі з сэсіі.




**16. НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ БЕЛАРУСІ. 20 гадоў.** -- Варшава, “Беларускія Ведамасьці”, -- 2011 г., 31 стар.

Гэта адбітак з кнігі “Сэсія Незалежнасьці”, выдадзены асобнай брашурай да 20-годдзя Незалежнасьці Беларусі.




**17. НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ – 25** (Да 25-годдзя Незалежнасьці Беларусі). -- Нью-Ёрк, «Беларускае Выдавецкае Таварыства ў Амэрыцы», -- 2016 г., 114 стар.,: іл.

У кнізе апавядаецца аб дасягненьні дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі ў 1991 годзе, аб каштоўнасьцях незалежнай дзяржавы і аб абставінах у сьвеце, якія павінна ўлічваць будучая вольная Беларусь. (У дадатку кнігі выкарыстаныя новыя і апублікаваныя раней фатаграфіі і дакуманты.)



**18. КУРАПАТЫ. Артыкулы, навуковая справаздача, фотаздымкі.** -- (Беларускі інстытут Навукі й Мастацтва. Менск -- Нью-Ёрк, 1993 г., 141 стар.: іл.

Кніга выдадзеная ў дзьвух мовах: ангельскай і беларускай, а пазьней, у 1994-м (гл. 16-А), выдадзеная ў выдаведзтве “Тэхналёгія” ў Менску).




**19. КУРАПАТЫ. Артыкулы, навуковая справаздача, фотаздымкі.** -- (Незалежная выдавецкая кампанія “Тэхналогія”, -- Менск, 1994 г., 180 стар.: іл.

Тут зьмешчаны артыкул З. Пазьняка і Я. Шмыгалёва “КУРАПАТЫ – ДАРОГА СЬМЕРЦІ”; артыкул З. Пазьняка “ШУМЯЦЬ НАД МАГІЛАМІ СОСНЫ...”; навуковая справаздача аб археалагічных раскопках ва ўрочышчы Курапаты (Брод) З. Пазьняка, М. Крывальцэвіча, А. Іова.

Зборнік зьяўляецца дакумэнтальным сьведчаньнем пра злачынствы бальшавіцкага рэжыму ва ўрочышчы Курапаты паблізу Менска. Курапаты – першае з адкрытых у Беларусі месцаў, дзе былі расстраляныя й закапаныя ахвяры сталінскіх рэпрэсіяў. Курапаты сталі сымбалем генацыду супраць Беларускага народу. Уключаныя ў зборнік матэрыялы абуджаюць памяць пра нявінна забітых, заклікаюць шанаваць свабоду й сумленьне.

**20. Зянон ПАЗЬНЯК, Валеры БУЙВАЛ. АБАРОНА КУРАПАТАЎ. НАРОДНЫ МЭМАРЫЯЛ.** Грамадзка-асьветніцкае выданьне: “Беларускія Ведамасьці”; Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, -- Варшава-Нью-Ёрк, 2012 г., 216 стар.: іл.




Гэта кніга двух аўтараў: Зянона Пазьняка і Валеры Буйвала. Яна ўяўляе сабой збор артыкулаў, успамінаў, матэр'ялаў, фатаграфіяў і перадрукаў, якія прысьвечаны тэме абароны Курапатаў ад зьнішчэньня антыбеларускім рэжымам. Разглядаецца пэрыяд адкрыцьця Курапатаў і ўзьнікненьне Народнага Мэмарыялу – Курапаты "Лес Крыжоў" -- у пачатку XXI стагоддзя. Апісана дзейнасьць энтузіястаў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ у будаўніцтве Мэмарыяла і падтрыманьні народнай памяці пра камуна-маскоўскі генацыд.

Зьнішчыць магілы хочуць пасьлядоўнікі і нашчадкі тых, хто забіваў, ды людзі бяз памяці. Абараняюць – нашчадкі забітых, тыя, хто памятае і разумее.

Кніга складаецца з 2-х частак. Першая – адмысловыя фатаграфіі, артыкулы і матэр'ялы аўтараў. У другой – факсімільныя адбіткі з археалагічнай справаздачы, з кніг і артыкулаў Зянона Пазьняка, інтэрв'ю Сяргея Навумчыка, Аляксандра Лукашука.

**21. КУПАПАТЫ.** -- Менск, 2007 г., 16 стар. іл. (асьветніцкая брашура).

Курапаты – наш боль і нязгасная памяць. Асобная ілюстраваная брашура пра Курапаты па-беларуску, па-польску, па-ангельску, па-нямецку, выдадзеная сябрамі Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ у Менску.




**22. НАРОДНАЯ ПРАГРАМА "ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ". Гэта праект новай Беларусі. Грамадзка-палітычнае выданьне.** -- Варшава-Нью-Ёрк-Менск, "Беларускія Ведамасьці", -- 2017 г., 71 стар.

Аўтарскі калектыў:
-- Зянон Пазьняк – кіраўнік калектыву аўтараў; Павел Усаў; Сяргей Папкоў; Юры Беленькі; Павел Міpановіч; Лявон Баршчэўскі; Юры Цехановіч; Мікалай Крыжаноўскі; Анатоль Горскі.

Праект распрацаваны салідарным калектывам палітыкаў і спэцыялістаў дзеля вольнай прышласьці краіны, для выкарыстаньня будучым Тымчасовым ці Пераходным Урадам дзяржавы альбо іншым палітычным утварэньнем, якое пасьля ліквідацыі антынароднага рэжыму возьме на сябе адказнасьць за лёс і будучыню Рэспублікі Беларусь.

Праграма адлюстроўвае тыя крокі, якія неабходна рабіць у пераходны пэрыяд пасьля зьмены рэжыму, бо трэба мець упарадкаванае разуменьне задач, каб дасягнуць станоўчага разьвіцьця.

Аўтарамі разглядаецца палітычная сістэма пераходнага пэрыяду; эканоміка, фінансы, падаткі, зямля, энэргетыка; адукацыя, навука, культура; разглядаюцца пытаньні ўзаемаадносінаў сям'і, асобы, грамадзтва, дзяржавы і інш.